ску, Супраслі, Тураве і інш. атрымалі ад буйных свецкіх феадалаў шэраг маёнткаў і інш. ахвяраванняў. У 1521 І. II разам з К. Астрожскім дамогся ад Жыгімонта І пастановы аб паляпшэнні становішча правасл. насельніцтва Галіцыі (у складзе Польскага каралеўства). Завяшчаў Астрожскаму апеку над усёй мітрапаліцкай маёмасцю да абрання новага мітрапаліта.

*Літ.:* Макарий. История Русской церкви. Спб., 1879. С. 161—208; Мартос А. Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. Мн., 1990. С. 124—125. *Юрый Бажэнаў.*

**ІОСІФ III** (?— 1534), праваслаўны царк. дзеяч ВКЛ. Паходзіў са шляхецкага роду. У 1516 архіепіскап полацкі. Мітрапаліт кіеўскі, галіцкі і ўсяе Русі (1522—34). Правіў ва ўмовах вострай барацьбы каталіцкіх і правасл. феадалаў за ўплыў на вял. князя ВКЛ і караля польскага Жыгімонта І. Пры дапамозе гетмана К. Астрожскага (гл. ў арт. *Астрожскія*) дамогся ад Жыгімонта І новых прывілеяў для правасл. цэркваў і манастыроў у Віцебску, Кіеве (у Кіеве-Пячэрскай лаўры ў 1530 быў пахаваны К. Астрожскі), Мінску, Пінску, Троках і інш.

*Літ.:* Макарий. История Русской церкви. Спб., 1879. С. 209—233; Мартос А. Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. Мн., 1990. С. 125—126.

**ІОСІФ IV**, уніяцкі мітрапаліт кіеўскі і галіцкі, гл. *Руцкі* І.В.

**ІОСЬКА** Міхаіл Іванавіч (5.3.1929, в. Бародзічы Ваўкавыскага пав. Беластоцкага ваяв., цяпер Зэльвенскі р-н — 20.2.1986), беларускі філосаф, гісторык, літаратар. Канд. філас. н. (1966). Скончыў БДУ (1954). З 1954 на камсамольскай і парт. рабоце, у 1957—63 працаваў журналістам у Самаркандзе. З 1966 выкладчык БДУ, з 1984 у Мінскім Ін-це культуры. Вывучаў нац. адносіны, светапогляд вучонага і рэвалюцыянера М.Судзілоўскага, бел. пытанне ў працах К.Маркса і Ф.Энгельса, малавядомыя старонкі бел. культуры. Аўтар дакументальных аповесцяў пра старшыню СНК Туркестанскай АССР У.Д.Фігельскага, пра кіраўніка антыфаш. падполля ў Нарвегіі ў час 2-й сусв. вайны М.Садоўнікава.

*Тв.:* Белоруссия и Узбекистан. Мн., 1970; Николай Судзиловский-Руссель: Жизнь, рев. деятельность и мировоззрение. Мн., 1976; К.Маркс, Ф.Энгельс и революционная Белоруссия. 2 изд. Мн., 1985.

*Аляксей Пяткевіч.*

**ІОЎ** Алег Вільгельмавіч (н. 14.1.1958, в. Бронная Гара Бярозаўскага р-на), беларускі археолаг. Канд. гіст. н. (1991). Скончыў БДУ (1984). У 1979—94 і з 1995 у Ін-це гісторыі АН Беларусі, у 1994—95 у выд-ве «Беларуская энцыклапедыя». Даследуе гісторыю Беларусі 9—13 ст., праблемы эканам. развіцця і паліт. гісторыі Тураўскага княства. Адзін з удзельнікаў эксгумацыі ахвяр паліт. рэпрэсій ва ўрочышчы *Курапаты.*

*Тв.:* Этнічны склад насельніцтва Заходняга Палесся ў X—XIII стст. (па матэрыялах сельскіх паселішчаў) // Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992; Турава-Пінскае княства // Бел. думка. 1992. № 5; Круговая керамика поселений IX—XI вв. западной части Белорусского Полесья // Древнерусская керамика. М., 1992; Гаспадарча-эканамічныя сувязі насельніцтва Заходняга Палесся ў IX — пач. XI стст. (разам з В.С.Вяргей) // Гістарычна-археалагічны зборнік. Мн., 1993. Ч. 1; Курапаты. 2 выд. Мн., 1994 (у сааўт.).



В.М.Іпатава.

**ІОФЕ** Адольф Абрамавіч [10(22).10.1883, Сімферопаль — 17.11.1927], савецкі дзярж. і парт. дзеяч, дыпламат. З 1903 чл. РСДРП. У 1917 у ліку «міжраёнцаў» прыняты ў бальшавіцкую партыю. У ліст. 1917 — студз. 1918 старшыня, у студз. — лют. 1918 кансультант сав. дэлегацыі на перагаворах з Германіяй у Брэст-Літоўску. 2(15).12.1917 ад імя сав. дэлегацыі падпісаў пагадненне аб перамір'і з Германіяй і яе саюзнікамі. У крас.—снеж. 1918 сав. пасол у Германіі. У студз.—лют. 1919 у Мінску як прадстаўнік ЦК РКП(б) выконваў рашэнне аб далучэнні да РСФСР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губ., стварэнні Літ.-Бел. ССР. У 1920—21 старшыня дэлегацыі РСФСР на мірных перагаворах з Эстоніяй, Латвіяй, Літвой, Польшчай, у выніку якіх быў заключаны *Рыжскі мірны дагавор 1921.* У 1921—22 на сав. і парт. рабоце на Украіне, у Маскве. У 1922 чл. сав. дэлегацыі на Генуэзскай канферэнцыі, потым пасол у Кітаі, з 1924 у Аўстрыі. У 1918—19 канд. у чл. ЦК РКП(б). Чл. ЦВК СССР. Скончыў жыццё самагубствам. *Эмануіл Іофе.*

**ІОФЕ** Эмануіл Рыгоравіч (н. 20.3.1939, Беразіно), беларускі гісторык. Д-р гіст. н. (1993), праф. (1995). Скончыў БДУ (1961). Працаваў настаўнікам. З 1978 у Бел. пед. ун-це. Даследуе бел. гістарыяграфію, гісторыю навукі і культуры, грамадз. і Вял. Айч. войнаў, гісторыю бел. яўрэяў. Адзін з аўтараў кн. «Акадэмік У.І.Пічэта» (1981).

*Тв.:* Березино: Ист.-экон. очерк. Мн., 1986; Советские военачальники на белорусской земле. Мн., 1988; Из истории белорусской деревни: (Сов. историография соц.-экон. развития бел. деревни середины XVII — первой половины XIX в.). Мн., 1990; Исследование В.И.Пичетой аграрной реформы 1557 г. // Сов. славяноведение. 1972. № 3.

**ІПАЛІТ**, Старац, разьбяр па дрэве 17 ст. Манах з Оршы. Працаваў у палаце разьбярных і сталярскіх спраў Маскоўскага Крамля. З вучнямі Яфімам Анціп'евым, Данілам Грыгор'евым і Ларкам Юр'евым рэзаў і залаціў стаўпы і гербы царскіх карэт, іканастасы, рызніцы, шафы, куфры, ракі для мошчаў і інш. У 1679 стварыў рэльефнае распяцце для Галгофы ў царкве Уваскрэсення Славушчага і рысункі кафляных упрыгожанняў купалоў Верхняспаскага сабора ў Маскоўскім Крамлі.

**ІПАТАВА** Вольга Міхайлаўна (н. 1.1.1945, г.п. Мір Карэліцкага р-на), беларуская паэтэса, празаік. Скончыла БДУ (1967). У 1970—73 літ. супрацоўнік газ. «Літаратура і мастацтва». З 1985 гал. рэдактар літ.-драм. перадач Бел. тэлебачання. У 1989—91 заг. аддзела, нам. гал. рэдактара час. «Спадчына». З 1991 рэдактар штотыднёвіка «Культура». Друкуецца з 1959. Выдала зб. паэзіі і прозы «Раніца» (1969), «Ліпеньскія навальніцы» (1973), «Парасткі» (1976), «Вецер над стромай» (1977), «Дваццаць хвілін з Немезідай» (1981), «Перакат» (1984). Значнае месца ў творчасці І. займае гіст. тэматыка: аповесць «Прадыслава» (1971) прысвечана Ефрасінні Полацкай, у аповесці «За морам Хвалынскім» (1989) апісваецца падарожжа палачаніна Алексы, аповесць «Чорная княгіня» (1989) прысвечана кн. Лізавеце Астрожскай. Гісторыяй стараж. Беларусі насычаны аповесці «Святаслава», «Агонь у жылах крэменю», апавяданні «Набег», «Гайна і Мікаш», «Давыд Гарадзенскі» і інш., у якіх аўтар звяртаецца да гіст. постацяў і вобразаў часоў Полацкага княства (11—13 ст.) і Вял. кн. Літоўскага ў 16 ст. Піша для дзяцей. *Сяргей Тарасаў.*

**ІПАЦЬЕЎСКІ ЛЕТАПІС**, летапісны звод, складзены ў канцы 13 ст. ў паўд. Русі. Збярогся ў Іпацьеўскім (знойдзены ў 18 ст. ў Іпацьеўскім манастыры каля Кастрамы), Хлебнікаўскім, Ермалаеўскім і інш. спісах. Аб'яднаў 3 ранейшыя летапісныя творы: «*Аповесць мінулых гадоў*» (звесткі да 1117 уключна), *Кіеўскі летапіс* (1118—99) і *Галіцка-Валынскі летапіс* (1201—92). Прысвечаны пераважна паліт. гісторыі ўсх. славян, якая пададзена з патрыятычных пазіцый. Вылучаецца багаццем зместу, гіст. дакладнасцю, дасканаласцю выкладання. Важная крыніца па гісторыі Полацкага, Тураўскага, Кіеўскага, Галіцка-Валынскага княстваў, ВКЛ. Паслужыў літ. узорам і адной з крыніц «*Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага*» і *Хронікі Быхаўца.* Адзіны помнік, у якім, паводле меркаванняў некаторых вучоных, збярагліся ўрыўкі згубленага *Полацкага летапісу.* Многія апавяданні і аповесці І.л. — прыклад